**Вучэбная дысцыпліна “Зместава-фармальныя пошукі сучаснай беларускай лірыкі”**

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў схеме адук. праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята (агульная вышэйшая адукацыя) Спецыяльнасць: 6-05 – 0232-01 “Беларуская філалогія. Прафілізацыя”: літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць: дысцыпліна спецыялізацыі модуль “Спецкурсы” |
| **Кароткі змест** | Лірыка як адзін з асноўных родаў літаратуры. Агульная характарыстыка сучаснай беларускай лірыкі. Сучасная беларуская філасофская паэзія: асноўныя кірункі.. Інтэлектуальна-філасофская паэзія А.Разанава. Пейзажная лірыка: аспекты тэорыі і верыфікацыі. Навацыйныя з’явы ў пейзажнай лірыцы мяжы тысячагоддзяў. Жанрава-тэматычная разнастайнасць паэзіі А.Глобуса. Мастацкая індывідуальнасць Л. Рублеўскай. Інтымная лірыка: тэарэтычны аспект. Філасофскае асэнсаванне феномена кахання. Агульная характарыстыка сучаснай беларускай інтымнай лірыкі. Творчая асоба Э.Акуліна. Мастацкая мадэль свету В. Шніпа. Кампаратывістыка: паняцце, прынцыпы, законы. Класічныя традыцыі ў паэзіі беластоцкіх аўтараў. Г.Ахматава і Р.Баравікова: пераемнасць традыцый. Любоўная лірыка Л.Дранько-Майсюка ў кантэксце французскага мадэрнізму. Міфалагічныя і біблейскія матывы ў сучаснай паэзіі. Эксперыментальныя з’явы ў маладой паэзіі мяжы тысячагоддзяў**.** |
| **Фарміруемыя кампетэнцыі, вынікі навучання** | У выніку вывучэння дысцыпліны спецыялізацыі студэнт павінен **ведаць**: гісторыю, агульныя заканамернасці развіцця беларускай літаратуры; літаратуру роднасных па мове народаў; асноўныя этапы гісторыі сусветнай літаратуры; вядучыя накірункі беларускай і замежнай літаратуразнаўчай думкі; спецыфіку твораў вуснай народнай творчасці, іх сувязь з літаратурай;<br>павінен **валодаць:** метадалогіяй, гісторыяй, асноўнымі канцэпцыямі апісання беларускай мовы і літаратурнага працэсу; аналізам літаратурных з’яў у адзінстве філасофскіх, маральных, эстэтычных аспектаў; сістэмай ведаў аб асноўных напрамках развіцця літаратуры свайго народа; рознымі прыёмамі інтэрпрэтацыі мастацкіх тэкстаў (лінгвістычнымі, мастацкімі, крытыка-публіцыстычнымі і літаратуразнаўчымі); прыёмамі навуковай інтэрпрэтацыі фактаў беларускай літаратуры і культуры ў кантэксце сусветнага літаратурнага развіцця;<br>павінен **умець выкарыстоўваць:** раскрыццё важнейшых ідэйна-эстэтычных канцэпцый у літаратуры; сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці твораў розных жанраў з улікам іх моўных і нацыянальных асаблівасцей, а таксама сродкі мастацкай выразнасці; асноўныя інфармацыйныя тэхналогіі ў навучанні роднай мове і літаратуры; працы, прысвечаныя вывучэнню своеасаблівасцей жанраў і іх мастацкіх вартасцей.<br>Патрабаванні да прафесійнай кампетэнтнасці спецыяліста:<br>СК-33. Разумець асаблівасці і характарызаваць тэндэнцыі развіцця беларускай паэзіі на сучасным этапе, аналізаваць вершаваныя творы ў арганічным адзінстве формы і зместу, у кантэксце традыцый і навацый. |
| **Прэрэквізіты і пострэквізіты** | “Сучасная беларуская літаратура”, “Уводзіны ў літаратуразнаўства”, “Тэорыя літаратуры”, “Гісторыя замежнай літаратуры”, “Гісторыя беларускай літаратуры” |
| **Працаёмкасць** | Агульная колькасць гадзін – 90; аўдыторная колькасць гадзін – 34, з іх: лекцыі – 14, практычныя заняткі – 14, кіруемая самастойная работа (КСР) – 6, 3 залiковыя адзінкі. |
| **Сем., формы атэстацыі** | 6-ы семестр, тэст, залік |